© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

*Адказ Злучаных Штатаў на высылку амерыканскага дыпламата (стар. 3)*
*Яшчэ адзін сцяг Мірона. Цяпер — у Віцебску (стар. 4)*

# СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 41.430
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Серада, 26 сакавіка 1997 № 33 Кошт свабодны

## Ступнікаў застаецца

**Учора карэспандэнты замежных СМІ, акрэдытаваныя ў Беларусі, наладзілі акцыю пратэсту.**

Журналісты сабраліся каля міністэрства замежных справаў з патрабаваннем забяспечыць умовы для сваёй прафесійнай дзейнасці. Цярпенне журналістаў лопнула пасля таго, як быў пазбаўлены акрэдытацыі карэспандэнт расійскага тэлеканала НТВ Аляксандр Ступнікаў. Міністэрства замежных справаў у сваёй заяве абвінавaціла журналіста ў распаўсюджванні *«тэндэнцыйных матэрыялаў, якія прыводзяць да дэзінфармацыі грамадскай думкі ў Беларусі і Расіі»*.

Намеснік галоўнага рэдактара НТВ Станіслаў Мармітка ў тэлефоннай размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ назваў дзеянні беларускіх уладаў *«прыскорбнымі»*. Аляксандр Ступнікаў працягвае выконваць свае абавязкі дырэктара-карэспандэнта прадстаўніцтва тэлекампаніі НТВ у Мінску, хаця цяпер, пасля пазбаўлення афіцыйнай акрэдытацыі, працаваць яму больш складана.



*Нягледзячы на пазбаўленне акрэдытацыі, А.Ступнікаў працягвае працаваць у Мінску.*

**По загадзе старшыні Белтэлерадыёкампаніі Рыгора Кісяля ў будынак Беларускага тэлебачання больш не дапускаюцца расійскія тэлежурналісты — тым самым іх пазбавілі магчымасці перадаваць свае тэлерэпартажы ў Маскву. Супрацоўнікі НТВ паспрабавалі перадаць тэлерэпартаж праз Літву. Аднак на беларуска-літоўскай мяжы беларускія мытнікі сканфіскавалі касету з тэлерэпартажам пра падзеі ў Мінску. Да карэспандэнта балтыйскага бюро НТВ, які спецыяльна прыехаў да мяжы, гэтая касета так і не патрапіла.

Беларускія ўлады пазбавілі Ступнікава акрэдытацыі якраз у той дзень (24 сакавіка), калі з нашай краіны быў высланы першы сакратар пасольства ЗША Серж Аляксандраў. У заяве беларускага знешнепалітычнага ведамства робіцца акцэнт на ізраільскім грамадзянстве Аляксандра Ступнікава. У размове з карэспандэнтам СВАБОДЫ Ступнікаў адзначыў, што цяпер беларускія ўлады па тым жа сцэнарыі могуць выдварыць з краіны любога замежнага журналіста, які рыхтуе рэпартаж у час апазіцыйнага мітынгу.

**Алесь ДАШЧЫНСКІ**

## Пасля размовы ў міліцыі Карпенка апынуўся ў рэанімацыі

**Намеснік старшыні ВС Генадзь Карпенка быў затрыманы ў панядзелак у Мінску міліцыянтамі і дастаўлены ў суд Савецкага раёну.**

Г.Карпенка разам з дэпутатам Людмілай Грязновай былі на прыёме ў амбасадзе Чэшскай рэспублікі. Прыкладна ў 17 гадзін на выхадзе з пасольства Карпенку спынілі некалькі міліцыянтаў і прапанавалі сесці ў машыну.

У Савецкім райсудзе, куды быў дастаўлены віцэ-спікер, яго абвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным шэсці 23 сакавіка, але Карпенка адмовіўся даваць паказанні і запатрабаваў адваката. Суддзя І.Крывалапаў быў вымушаны перанесці судовае паседжанне на 1 красавіка.

У судзе да Г.Карпенкі падыйшлі людзі ў цывільным і прапанавалі пад'ехаць на размову ў Фрунзенскі РАУС. Карпенка прыняў запрашэнне і папрасіў калегаў, якія яго чакалі, не турбавацца. Што далей адбывалася з віцэ-спікерам — застаецца невядомым. Былы міністр унутраных справаў Юрый Захаранка спрабаваў даведацца пра лёс Карпенкі ў начальніка Фрунзенскага РАУС, але той адмовіўся даваць інфармацыю. Толькі ў 2 гадзіны ночы стала вядома, што Генадзь Карпенка ў 22:00 у цяжкім стане быў дастаўлены з міліцэйскага пастарунку ў шпіталь «лечкамісіі» і змешчаны ў рэанімацыйнае аддзяленне з сардэчным прыступам. Палату, у якой знаходзіўся віцэ-спікер, ахоўвалі амонаўцы. Учора раніцай Г.Карпенка быў пераведзены з рэанімацыі ў тэрапеўтычнае аддзяленне і да яго была дапушчаная жонка. Па словах галоўнага урача лечкамісіі, стан здароўя Генадзя Карпенкі *«здавальняльны»*.

**Альгерд НЕВЯРОЎСКІ**

## Зварот старшыні Вярхоўнага Савета РБ

### да супрацоўнікаў праваахоўных органаў і суддзяў Рэспублікі Беларусь

Рэжым А.Лукашэнкі развязаў сапраўдную вайну супраць грамадзянаў Беларусі, якім дарагія ідэалы свабоды, дэмакратыі і нацыянальнага суверэнітэту. Прынятыя ім антыканстытуцыйныя дэкрэты самым грубым чынам парушаюць правы і свабоды чалавека. У краіне ўсталяваўся паліцэйскі рэжым. Самыя жорсткія меры прымяняюцца да людзей, якія асмеліліся выказаць сваё незадавальненне становішчам у краіне. Разгоны мірных дэманстрацый, масавыя арышты, незаконныя вобыскі сталі звычайнай з'явай у Беларусі.

Асаблівa праследуюцца моладзь, кіраўнікі Вярхоўнага Савета, палітычных партый і грамадскіх рухаў. Сотні людзей зазнаюць рэпрэсіі толькі за тое, што спрабавалі выказаць сваё незадавальненне насіллем і дэспатызмам. За ўдзел у мірнай маніфестацыі ў Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь быў пакараны 20 мільённым штрафам старшыня Вярхоўнага Савета 12-га склікання Мечыслаў Грыб, чый подпіс стаіць пад Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь. Кінуты ў турму ордэнаносец, двойчы паранены ў Афганістане палкоўнік Уладзімір Барадач.

Цынічнасць рэжыму не мае межаў: у рэанімацыйным аддзяленні бальніцы каля ложка намесніка старшыні Вярхоўнага Савета 13-га склікання Генадзя Карпенкі кругласутачна дзяжураць узброеныя амонаўцы, гатовыя цягнуць яго ў суд па першым загадзе зверху.

Як старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, які еўрапейская супольнасць прызнала адзіным законным органам, звяртаюся да вас — супрацоўнікі міліцыі, пракуратуры і судоў. Апамятайцеся, не рабіцеся саўдзельнікамі антыканстытуцыйнага рэжыму! Стойце на варце законнасці!

Як чалавек з вялікім жыццёвым вопытам, ведаю, што прынцыповая пазіцыя патрабуе вялікай мужнасці. Але гісторыя не раз паказвала — менавіта такая грамадзянская стойкасць не давала краіне зрынуцца ў бездань хаосу, ратавала людзей ад пакутаў і несправядлівасці.

Будзьце верныя свайму абавязку!

**Сямён ШАРЭЦКІ**

## У судах – запарка

**У панядзелак у раённых судах Мінска ішлі працэсы над дэманстрантамі, арыштаванымі міліцыяй 23 сакавіка падчас святкавання 79-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Суд Маскоўскага раёна пакараў арыштам на 5 сутак выканаўчага дырэктара даследчага цэнтра «Беларуская перспектыва» Віктара Івашкевіча. У Кастрычніцкім райсудзе на 15 сутак былі асуджаны Анатоль Плаўнер, Уладзімір Міцкевіч і Яўген Біч, а Канстанцін Ромаш атрымаў 10 сутак. Суд Ленінскага раёна таксама караў зняволеннямі. Старшыня Барысаўскай рады БНФ Анатоль Аскерка правядзе ў зняволенні 10 сутак, а сп.Акрасцёнак — 5 сутак. Па звестках прэс-службы мінскай міліцыі, за ўдзел у несанкцыянаваным шэсці былі складзены пратаколы на 63 чалавек. Большасць з іх былі пакараныя штрафамі (ад 2 млн. 600 тыс. рублёў і вышэй). Некалькі чалавек было папярэджана, а Ірына Голубева нават апраўдана.

Хаця суддзі і працавалі ўвесь панядзелак не пакладаючы рук, але ўсё роўна не паспелі асудзіць усіх затрыманых. Частка людзей засталася ў турэмных камерах да аўторка. У аўторак колькасць арыштантаў павялічылася. Ленінскі райсуд адправіў на 5 сутак за краты Сяргея Малахава і Алеся Кунчэўскага.

А тым часам арыштаваныя 20 сакавіка за арганізацыю студэнцкай акцыі пратэсту на плошчы Я.Коласа і асуджаныя на 10 сутак Сяргей Марцалеў і Павел Карназыцкі аб'явілі сухую галадоўку і ўчора (праз пяць дзён галадоўкі) былі дастаўлены са спецпрыёмніка ў аддзяленне эндакрыналогіі 1-й мінскай клінікі. У турэмнай камеры працягвае галадоўку лідэр сацыял-дэмакратаў Мікола Статкевіч, якога асудзілі на 10 сутак зняволення.

**Альгерд НЕВЯРОЎСКІ**

## Нямецкая дапамога пад пытаннем

**Пяць дэпутатаў нямецкага Бундэстага накіравалі пісьмовы пратэст прэзідэнту Лукашэнку, выкліканы дзеяннямі Савета бяспекі супраць Беларускага дабрачыннага фонда «Дзецям Чарнобыля».**

Нямецкія дэпутаты Герт Вайскірхен, Дытрых Шперлінг, Ірмгардт Шветцэр, Герд Попэ, Хрысціян Шмідт прадстаўляюць уплывовыя партыі ФРГ. Яны патрабуюць ад прэзідэнта Лукашэнкі *«неадкладна спыніць акцыю супраць фонда»*. У адваротным выпадку дэпутаты звернуцца з прапановай да Бундэстага аб прыпыненні фінансавай дапамогі Беларусі.

**А.Д.**

## У еўрапейскай сям'і хуліганаў не любяць

**«Я не магу знайсці ў Беларусі нават мінімума свабоды, але я думаю, што яшчэ не ўсё страчана».**

Так заявіла дэпутат Еўрапарламента Элізабэт Шродтар на мемарыяльнай канферэнцыі «Беларусь на мяжы стагоддзяў і цывілізацый», якую днямі правёў у Мінску Нацыянальны цэнтр стратэгічных ініцыятываў «Усход—Захад» у памяць свайго першага прэзідэнта Анатоля Майсені.

Элізабэт Шродтар падкрэсліла, што міжнародная супольнасць не прызнала вынікаў рэферэндуму, што за легітымны парламент Еўрасаюз прызнае толькі Вярхоўны Савет і бачыць выйсце з цяперашняй сітуацыі ў правядзенні свабодных парламенцкіх выбараў на аснове Канстытуцыі 1994 г. *«АБСЕ гатовая на пасярэдніцтва ў перамовах паміж апазіцыяй і прэзідэнтам»*, — паведаміла Э.Шродтар. Яна таксама сказала, што ніхто ў Еўропе не жадае чыніць перашкодаў Беларусі ва ўступленні ў еўрапейскія структуры. *«Мы хацелі б прыняць Беларусь у Савет Еўропы»*, — адзначыла сп-ня Шродтар, — *аднак зрабіць гэта не можам, пакольку ў вашай краіне парушаюцца прынцыпы парламентарызму і дэмакратыі»*.

Супрацоўнік галандскай амбасады Каспар Велдкамп паведаміў: *«У дакладзе місіі Еўрасаюза канстатуецца, што адзінай законнай з'яўляецца Канстытуцыя 1994 г., а адзіным легітымным заканадаўчым органам — Вярхоўны Савет. Беларусь, калі яна хоча ўвайсці ў еўрапейскія структуры, павінна дзейнічаць у рамках правілаў еўрапейскай сям'і, асноўнае з якіх — захаванне правоў чалавека. Еўрасаюз гатовы дапамагчы Беларусі і прадаставіць спецыялістаў па розных галінах правоў чалавека, у прыватнасці, у сферы свабоды прэсы»*.

Цікавую перспектыву наконт ўзаемадносінаў Беларусі і NATO выказаў на канферэнцыі былы міністр замежных справаў П.Краўчанка. *«Нейтралітэт Беларусі*, — лічыць ён, — *гэта недасягальная мара. Калі Беларусь будзе інтэгравацца ў еўрапейскія структуры (а гэта рана ці позна адбудзецца), дык яна непазбежна мусіць рабіць гэта не толькі ў палітычных і эканамічных, але і ў ваенных адносінах — г.зн. уступіць у NATO»*. Праўда, пакуль П.Краўчанка лічыць гэта заўчасным.

**Вадзім КАЗНАЧЭЕЎ**

## Будзе не да смеху?

**У Мінскі гарвыканкам ад прадстаўнікоў БНФ пададзеныя заяўкі на правядзенне чарговых акцый – 1 і 2 красавіка.**

1 красавіка а 17-й гадзіне ў скверы на рагу вуліц Ленінградскай і Свярдлова (у раёне чыгуначнага вакзала) павінна прайсці тэатралізаванае дзейства *«Дзень смеху. Інтэграцыя з Расіяй-97»*. Удзельнікі акцыі збіраюцца наладзіць своеасаблівыя провады дэлегацыі беларускіх дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў у Маскву на ўрачыстасці, прысвечаныя першым угодкам утварэння Супольнасці Беларусі і Расіі.

2 красавіка апазіцыя плануе правесці шэсце і мітынг. Шэсце мяркуецца пачаць а 17-й гадзіне ў парку імя Горкага і завяршыць на рагу вуліц Кісялёва і Крапоткіна, дзе размяшчаецца расійскае пасольства. Там жа запланаваны мітынг.

Адказу на пададзеныя заяўкі арганізатары пакуль не атрымалі.

*БелаПАН*

## Міліцыя падлічыла страты

**Падчас маніфестацыі, якая адбылася ў мінулую нядзелю, пацярпелі 17 супрацоўнікаў праваахоўных органаў.**

Такую лічбу паведаміла прэсслужба МУС. Па словах яе прадстаўніка, 11 работнікаў міліцыі і 6 ваеннаслужачых унутраных войскаў атрымалі траўмы галавы і твару. Двое міліцыянтаў знаходзяцца ў шпіталі. Было таксама пашкоджана 5 адзінак міліцэйскай тэхнікі (выбітыя фары, шыбы, адной машыне пракалолі задняе кола).

Поўных звестак аб пацярпелых дэманстрантах мы не маем, пакольку многія з іх палічылі за лепшае не звяртацца па дапамогу. Як паведамляе БелаПАН, «хуткая дапамога» прывезла з аддзялення міліцыі ў 9-ю і 2-ю клінікі двух мужчын з чэрапна-мазгавымі траўмамі, адну жанчыну (з пабітым тварам) даставілі ў 4-ю клініку.

**Б.П.**

## Камунальнікі хочуць больш грошай

**З 1 красавіка адбудзецца чарговае павышэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі.**

Пра гэта паведаміў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Барыс Батура. Ен запэўніў, што павышэнне будзе «невялікім» — на 15 працэнтаў.

Апошні раз тарыфы павышаліся 1 студзеня гэтага года, таксама на 15%. Аднак, як сцвярджаюць спецыялісты, гэтае павышэнне не дапамагло камунальнікам: грошы «з'ела» інфляцыя. Па словах Б.Батуры, тарыфы будуць паступова расці і далей — з другой паловы гэтага года і да заканчэння наступнага ацяпляльнага сезона; мяркуецца, што павышэнне складзе 47%. Згодна з перспектыўнымі планамі, да 2000 года насельніцтва павінна пакрываць затраты на вытворчасць жыллёва-камунальных паслуг на 100% (цяпер гэты паказчык не перавышае 45%).

*БелаПАН*

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



# Арышты, суды, штрафы

**Студэнцкі праваабарончы клуб пры Беларускім Хельсінкскім камітэце накіраваў у замежныя пасольствы інфармацыю аб грубых парушэннях правоў чалавека, у тым ліку моладзі.**

14 сакавіка, падчас акцыі «Беларусь у Еўропу-2», на працягу якой улады не далі дазволу, сілавыя структуры затрымалі каля 150 чалавек, у тым ліку маладых людзей ва ўзросце 14–17 гадоў. Некаторых трымалі за кратамі па трое сутак (да 12 чалавек у камерах пры норме 4–5). Толькі 17 сакавіка, як заяўляюць праваабаронцы — пры шматлікіх парушэннях заканадаўства, пачаліся суды, якія скончыліся пераважна прыгаворамі да розных тэрмінаў заключэння і штрафамі ў памеры 100–250 долараў. Затрыманні праводзіліся і 15 сакавіка — падчас святкавання Дня Канстытуцыі.

Студэнцкі праваабарончы клуб мае звесткі аб праследаваннях палітычна актыўных студэнтаў некаторых ВНУ і таму просіць замежныя пасольствы ўздзейнічаць на ўладныя структуры, каб спыніць гэты праслед. Акрамя таго, клуб звярнуўся да кіраўнікоў ВНУ з патрабаваннем *«не дапускаць уціску на студэнтаў, якія займаюцца палітычнай дзейнасцю па-за сценамі навучальных устаноў».*

*БелаПАН*

# Войска чакае навабранцаў

**Неўзабаве ваенкаматы пачнуць вясновы прызыў на вайсковую службу. У красавіку чарговае папаўненне маладых беларускіх хлопцаў начэпіць пагоны.**

Многія 18-гадовыя грамадзяне і выпускнікі вышэйшых навучальных установаў, якія мелі адтэрміноўку на час вучобы, без асаблівай ахвоты апрануць вайсковую форму. У час асенняга прызыву 806 чалавек не з'явіліся на прызыўныя ўчасткі. Найбольш юнакоў ухілілася ад службы ў Мінскай вобласці (419 чалавек), а таксама ў Гомельскай і Магілёўскай. Найменш «ухілянтаў» у Гродзенскай вобласці. Звычайна яны атрымліваюць пракурорскае папярэджанне альбо штраф да трох мінімальных зарплат. Да крымінальнай адказнасці такіх юнакоў прыцягваюць рэдка, бо гэтая з'ява —даволі масавая. Па словах супрацоўнікаў ваенкаматаў, многія юнакі, якія стараюцца ўхіліцца ад вайсковай службы, маюць для гэтага сур'ёзныя жыццёвыя прычыны. Некаторыя баяцца «дзедаўшчыны» або вялікіх фізічных нагрузак. А той, хто знайшоў высокааплатную працу, не хоча яе страціць.

Частка прызыўнікоў, наадварот, імкнецца трапіць у армію, ратуючыся ад беспрацоўя. Юнакі звычайна просяцца ў спецназ, міліцыю, а таксама ў дэсантныя войскі. Адслужыўшы абавязковы тэрмін, можна застацца ў войску на кантрактную службу. А некаторыя бацькі разглядаюць армію як нешта накшталт выпраўленчай калоніі, куды яны імкнуцца хутчэй «здаць» сваіх непаслухмяных бэйбусаў.

Ёсць яшчэ частка маладых грамадзянаў, якія разглядаюць вайсковую службу па-свойму. Яны не тое што лічаць яе бессэнсоўнай тратай часу, а нават зусім несумяшчальнай са сваімі поглядамі. З такімі прызыўнікамі праводзяцца «прафілактычныя гутаркі», нярэдка з цытаваннем Бібліі. Ваенкаматы забіраюць і гэтых юнакоў. Альтэрнатыўнай (цывільнай) службы ў Беларусі няма. Праект закона распрацаваны, паступілі прапановы ад вернікаў, але ўлады не спяшаюцца ўводзіць альтэрнатыўную службу, — каб не ўзмацняць пацыфісцкія настроі ў грамадстве. Набіраць салдатаў у армію і без таго складана.

Як паведамілі ў адным з мінскіх ваенкаматаў, да 60% прызыўнікоў аказваюцца не годнымі (альбо часова не годнымі) да вайсковай службы па стане здароўя. І гэтая праблема становіцца ўсё больш адчувальнай: сказваюцца і экалагічныя фактары, і эканамічныя ўмовы. У міністэрстве аховы здароўя сцвярджаюць, што сярод падлеткаў значна вырас рост захворванняў шчытападобнай залозы, органаў стрававання і кровазвароту, а таксама псіхічных расстройстваў. Недахоп харчавання прыводзіць да гіпатрафіі — дэфіцыту масы цела. А каму ж патрэбны слабы, худы, нямоглы салдат?

**Мікола ВАЙТОВІЧ**

# Что делают немецкие добровольцы в Минске

**На прошлой неделе началась 18-месячная альтернативная служба двух немецких парней в социальных учреждениях Минска. Их пребывание стало возможным благодаря организации «Акция искупления — служба мира». Теперь в Минске работают 6 молодых добровольцев из Германии.**

Основанная в 1958 году христианами-евангелистами «Акция искупления» признает историческую вину немцев и работает для того, чтобы тирания национал-социалистов не забывалась. «Служба мира» проводится прежде всего в тех странах, которые пострадали от гитлеровской Германии. С 1991 года стало возможным посылать волонтеров в Беларусь. Молодые немцы приезжают сюда добровольно и работают в социальных учреждениях, а также помогают тем, кто пережил еврейское гетто. В Германии после окончания гимназии молодые люди могут выбрать службу в армии (10 месяцев) или более продолжительную (18 месяцев) альтернативную службу в детских садах, домах-интернатах, домах для престарелых и инвалидов, в больницах и т.д. Для большей части немецкой молодежи естественно отказаться от военной службы.

Себастьян из Потсдама будет работать в православной общине в Минске, а также навещать пожилых людей. Нилс, второй из новоприбывших, начнет работу в детском отделении больных раком в Боровлянах. Двое других немецких парней — Табиас и Рут — проходят альтернативную службу в Новинках, в детском доме-интернате для психохроников. Все добровольцы выполняют педагогическую и терапевтическую работу, помогают медицинскому и педагогическому персоналу. Добровольцы не зависят от директора или других лиц в этих учреждениях. Их рабочие места дополнительные и неоплачиваемые.

В ФРГ после окончания школы желают поработать в социальной сфере также и девушки. «Акция искупления» направила Антонию и Мелани в Минск. Они помогают пожилым людям в еврейской общине и занимаются детьми-инвалидами в минском детском доме № 1.

В Минске альтернативники живут самостоятельно на квартирах. Новоприбывшим помогают те, кто находится здесь уже несколько месяцев. Живя в Минске, они имеют возможность изучать иностранный язык, познакомиться с культурой, а также пытаются внести свою лепту во взаимопонимание между народами для укрепления мира. Однако некоторым из них сложно работать именно в Минске для службы мира. Мелани говорит: *«Когда я вижу, как здесь милиция избивает демонстрантов, возникает иногда желание прервать мою «службу мира», так как мира здесь мало».*

**Катя МИЛЬКЕ**

*корреспондент-стажер газеты СВАБОДА, студентка Берлинского свободного университета*

# Цуглі для маладых

Улады сур'ёзна заняліся стварэннем новай маладзёжнай арганізацыі. Арганізацыі, якая б мела важкі ўплыў у маладзёжным асяроддзі і адначасова была надзейнай апорай уладаў. Работа ў гэтым накірунку ідзе «па плану». Не так даўно прэзідэнт Лукашэнка сустракаўся з прадстаўнікамі маладзёжных арганізацый, дзе публічна выказаў сваё бачанне маладзёжнай палітыкі, а ўжо з'явіўся праект статуту так званага Беларускага патрыятычнага саюза моладзі (БПСМ).

Беларуская моладзь доўгі час была фактычна падзеленай на дзве асноўныя групы. Адны заставаліся да грамадскага-палітычных падзей у краіне абыякавымі, другія з характэрным юначым максімалізмам былі ў апазіцыі да прэзідэнта і сённяшняй улады ўвогуле. Трэба сказаць, што да пэўнага моманту саму ўладу такое становішча калі і не задавальняла, то асабліва не хвалявала, бо, па вялікім рахунку, прэзідэнт і ягонае атачэнне зрабілі асноўную стаўку на старэйшае пакаленне. Аднак цяпер маладзёжная апазіцыя паступова набывае больш канкрэтныя арганізацыйныя абрысы — і ўлады занепакоіліся.

Старое пакаленне, у большасці сваёй выхаванае і цвёрда загартаванае ў атмасферы савецкіх часоў, нягледзячы на перабудовачныя змены, усё роўна караннямі трымаецца за мінулае і гатовае зноў жыць па-ранейшаму. Але за шасць з лішнім гадоў незалежнасці Рэспублікі Беларусь вырасла новае пакаленне, якое ў адрозненне ад сваіх бацькоў і дзядоў, адчула маладой душой, што такое свабода, і без яе сваё далейшае жыццё наўрад ці ўяўляе. Сённяшнія 14-22 гадовыя юнакі і дзяўчаты сфарміраваліся як грамадзяне з новымі ідэаламі. Таму зусім натуральная іхняя шчырая любоў і цяга да нацыянальнай сімволікі. Герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сцяг — гэта іх сімвалы. Яны для іх настолькі ж (а можа, нават яшчэ больш) дарагія, як сімволіка СССР і БССР для іхніх бацькоў. І любыя спробы забараніць гэтыя сімвалы будуць выклікаць толькі адваротную рэакцыю — што мы і бачым на вуліцах гарадоў, на дахах будынкаў, на слупах і асвятляльных мачтах стадыёнаў. Сёння найбольш радыкальная моладзь з такім жа імпэтам рве чырвоназялёныя сцягі, як паўтара гады таму адзін высокі чыноўнік публічна разарваў нацыянальны белчырвона-белы сцяг. Хто пасее вецер — пажне буру!

Першай яскравай праявай небяспечнай для ўладаў тэндэнцыі стала гарачая вясна 1996 года, калі мінскія студэнты і навучэнцы бралі актыўны ўдзел у палітычных акцыях пратэсту і грамадзянскага непадпарадкавання. Тое ж самае пацвярджае і пачатак Мінскай вясны—97. Маладзёжная апазіцыя сапраўды наблізілася да той рысы, пасля чаго зусім верагодна было б ператварэнне яе ва ўплывовую і арганізаваную палітычную сілу. А да якіх маштабаў можа вырасці маладзёжны пратэст, калі яго скіраваць ў патрэбнае рэчышча, яскрава паказалі падзеі ў Сербіі. Дарэчы, нягледзячыся на сваіх балканскіх «братоў», беларуская моладзь пачала выкарыстоўваць метады бялградскіх студэнтаў.

Усяго гэтага не маглі не заўважыць у прэзідэнцкай адміністрацыі. Каб скіраваць скіраваць энергію маладосці ў рэчышча, выгаднае ў першую чаргу для ўладаў, неабходны былі тэрміновыя меры. Такім чынам, відавочна, што новая арганізацыя «патрыятычнай накіраванасці» ствараецца яўна з палітычнымі мэтамі і аўральнымі тэмпамі. Але прынцыпы і метады аб'яднання моладзі ў новую структуру настолькі штучныя, што пад будучую дзейнасць саюза з самага пачатку закладваецца магутная міна, якая можа стаць ракавой.

Прэзідэнт загадаў — «стварыць!» За справу ўзяліся чыноўнікі, якія не пазбавіліся сацыялістычна-камуністычнага светабачання і, як вынік, скарысталі ранейшыя кандовыя метады. Не дзіўна, што ў кабінетах «прыдумалі» меры выключна адміністратыўнага характару, надзвычай далёкія ад сённяшніх патрэб і сапраўдных інтарэсаў маладога пакалення. Магчыма, аўтары праекта БПСМ хацелі як лепш, але атрымалася — як заўсёды. Аднак прэзідэнт падтрымаў прапановы і выказаў іх на сустрэчы з моладдзю. А тая сустрэча рыхтавалася і праводзілася пры такіх умовах, што выказаць заўвагі (не кажучы ўжо пра крытыку) там проста не было каму. Першы крок зроблены: створаны аргкамітэт і надрукаваны праект статута, чакаецца ўстаноўчы з'езд.

Праект статута БПСМ яскрава паказвае, што за размовамі аб уплывовай патрыятычнай арганізацыі дзяржаўныя мужы фактычна імкнуцца стварыць нешта накшталт былога камсамолу, гэткай арганізацыі, якая была б верным памочнікам «партыі ўлады». Хросныя бацькі БПСМ не ўлічылі, што сённяшняя моладзь хоча (і будзе імкнуцца) быць самастойнай.

Адначасова нельга абмінуць і іншыя відавочныя аспекты праблемы. У прыватнасці, БПСМ у сённяшніх умовах мае ўсе шанцы стаць не арганізацыяй шчырых і перакананых прыхільнікаў дзяржаўных ідэй, а аб'яднаннем ліслівцаў і ўгоднікаў прэзідэнта, якія будуць кіравацца зусім не дзяржаўнымі інтарэсамі, і нават не афіцыйнай ідэалогіяй, — а выключна — ўласнай выгадай.

Пры пэўных умовах любая арганізацыя можа стаць падобнай да фінансавай піраміды — наверсе знаходзяцца функцыянеры, якія гатовы ісці на любыя крокі, каб захаваць сваё прывілеяванае становішча, бо маюць значныя сацыяльныя перавагі, ільготы г.д. І, падобна, якраз па такім прынцыпе ствараецца новы саюз. Сёння вярхушка БПСМ, можна сказаць, ужо вызначылася (улады зрабілі апору на адыёзную арганізацыю «Прамое дзеянне», якая ў маладзёжным асяроддзі да пэўнага часу не была нават вядомая, не кажучы ўжо пра папулярнасць). Такім чынам, справа засталася за малым — шараговымі членамі. А стварыць безаблічную масавасць не так ужо і складана. Таталітарны камсамольскі вопыт дае шырокую глебу для аднаўлення ранейшых рычагоў ціску і добраахвотна-прымусовага залічэння ў арганізацыю — асабліва ў дзяржаўных і навучальных установах.

Аднак не трэба забывацца на тое, што сённяшнюю моладзь можна колькі заўгодна агітаваць ці запалохваць, але перайначыць яе светабачанне практычна немагчыма. Людзі заўсёды захоўваюць у душы вернасць сваім ідэалам, хоць часам вымушаныя прыстасоўвацца і весці двайны лад жыцця. Гэтак ужо было ў камсамоле: многія юнакі і дзяўчаты хадзілі на сходы і штомесяц плацілі членскія складкі, распрацоўваючы адначасова планы развалу і знішчэння арганізацыі.

Зрэшты, нават Беларускі саюз моладзі (БСМ), пераемнік савецкага камсамола, не спяшаецца ў новую арганізацыю, бо не прымае тыя прынцыпы, на якіх ідзе стварэнне БПСМ.

На заканчэнне хацелася б звярнуць увагу на яшчэ адзін — можа, нават самы небяспечны — фактар. Калі арганізацыя ствараецца па інструкцыі зверху, то яшчэ невядома, як адрэагуе сама моладзь на падобныя дзеянні. Дзякуй Богу, у Беларусі яшчэ не было, каб маладыя прыхільнікі розных палітычных ідэй фізічна высвятлялі сваё адносіны. Але грубымі, прымусовымі дзеяннямі ўлады могуць разбурыць гэтую раўнавагу, якая пакуль захоўваецца ў маладзёжным асяроддзі. Таму ў сённяшніх умовах трэба дзейнічаць асабліва асцярожна — як кажуць, скальпелем, а не лапатай. Беларускае грамадства і так моцна расколатае, таму нельга далей сеяць зерне варожасці і дзяліць тую ж моладзь на «сваіх» і «чужых», на «чэсных» і «нячэсных», на патрыётаў і непатрыётаў. Слова «патрыятызм» для кожнага мае сваё значэнне: для нас Радзіма — гэта Беларусь, а для кагосьці — прастора «ад Брэста да Курылаў».

**Іван БАС**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



## Ответ Соединенных Штатов на высылку американского дипломата из Минска

**Государственный департамент 24 марта послал строгое предупреждение белорусскому правительству в ответ на высылку из Беларуси американского дипломата. В нем, в частности, говорится:**

Соединенные Штаты выражают сожаление по поводу необоснованного и совершенно неоправданного ареста, задержания и выдворения из страны американского гражданина Сержа Александрова, первого секретаря посольства США в Минске.

Повод для выдворения Александрова — его якобы *«провокационные действия»* во время несанкционированной демонстрации, а также действия, которые *«выходят за рамки Венской конвенции 1961 года»* — явно ложен.

Действуя в рамках своих обычных дипломатических обязанностей, Александров наблюдал за демонстрацией протеста. Последние несколько недель правительство Беларуси все чаще прибегает к насильственной и диктаторской практике для подавления законных протестов. Участники демонстрации и прохожие подвергались нападениям и задержаниям без предъявления им обвинения. Американским гражданам, застигнутым этими насильственными событиями, не разрешили связаться с представителями консульства.

Эти шаги представляют собой явное нарушение международно принятых принципов прав человека, которые Беларусь, будучи членом ОБСЕ, обязана выполнять.

*USIA*

## Нарушения прав человека явились причиной отказа США предоставить помощь Беларуси в размере 40 миллионов долларов

**20 марта Госдепартамент ответил на вопросы о Беларуси, заданные в ходе брифинга.**

**Вопрос: Почему Соединенные Штаты остановили помощь Беларуси в размере 40 миллионов долларов?**

Ответ: В целом причина состоит в том, что недостаточно уважаются права человека.

Конгресс постановил, что каждая страна, которой, на основании Закона о поддежке свободы и Закона о взаимном сокращении угрозы от 1992-93 годов (Закон Нанна-Лугара), правительство США предоставляет помощь в том или ином виде, должна быть оценена с точки зрения соблюдения ею прав человека. Государственным департаментом установлено, что Беларусь не отвечает международно признанным стандартам соблюдения прав человека.

**Вопрос: Каковы последствия подобной оценки?**

Ответ: Наша Программа взаимного сокращения угрозы будет приостановлена после того, как завершатся мероприятия, на которые уже были выделены средства. На уничтожение ракетных пусковых площадок уже выделены средства и эти мероприятия будут продолжены. Но другие работы, которые были запланированы, но на которые еще не отпущены средства, проводиться не будут.

Юридически мы не можем предоставить 40 миллионов долларов по Программе взаимного сокращения угрозы.

Если в 1998 году Беларусь будет отвечать стандартам соблюдения прав человека в 1997 году или если Беларусь, с нашей точки зрения, настолько улучшит положение с правами человека, что можно будет пересмотреть ее оценку позднее в 1997 году, мы сможем возобновить финансирование проектов, включая уничтожение инфраструктуры, связанной с ядерным оружием, захоронение ракетного топлива, радиологический контроль и полное финансирование мероприятий по контролю над экспортом ядерного и другого оружия.

**Вопрос: Какие проблемы с правами человека вы видите в Беларуси?**

Ответ: Конституционный референдум, проводившийся в ноябре 1996 года, всеми рассматривался как недемократический. Мы пришли к такому же заключению. И к такому же заключению пришла Организация по безопасности и сотрудничеству в Европе (ОБСЕ), членом которой является Беларусь.

Начиная с ноябрьского референдума, неуклонно идет концентрация исполнительной власти президентом Лукашенко. Этот поцесс ставит под угрозу основополагающие принципы демократии, особенно разделение властей.

Исполнительная власть также усилила подавление свободы слова в 1996 году, установив практически тотальный контроль над средствами массовой информации. Правительство прибегло к насилию для разгона мирных демонстраций оппозиции и совсем недавно арестовало прохожих, которые оказались поблизости от этой демонстрации.

В начале этого месяца правительство выслало американского гражданина, возглавляющего американскую неправительственную организацию, поддерживающую развитие демократии и гражданского общества в Беларуси.

*USIA*

# Требуются титаны, а есть только акыны

**Константин СКУРАТОВИЧ**

На концерты современных эстрадных кумиров молоденькие девчушки покупают билеты по двойной и тройной цене — но именно в первый ряд. Второй или третий их не устраивает. Такова природа популярной культуры, не терпящей посредников в общении с кумиром.

Можно, конечно, сетовать на примитивизм, можно даже бороться с идолопоклонством и предлагать массам высокие образцы, но такая борьба изначально обречена на провал. В конечном итоге прав критик, который все высоколобые обвинения против «попсы» опроверг одним аргументом: **популярное** есть синоним **народного**, поскольку слово произведено от *populus* (народ). А обвинения народа в отсутствии вкуса совершенно бесперспективны.

В этом убеждают и мизерные результаты борьбы комсомольско-партийного агитпропа со стилягами, битломанами, панками и тому подобными «буржуазными перерожденцами». Всякая несправедливо нанесенная обида только удесятеряла их силы и стремление следовать за своим кумиром до конца. Что называется, бился о Леннона темный класс...

О Ленина, писал поэт, тоже бился темный класс. Бился в судорогах, равно как и Ленин. Этакое состояние темного взаимного экстаза (когда толпа звереет от запаха крови, а вожди подстрекают к кровопусканиям).

В желании человека иметь больше отпущенного Богом и природой нет ничего противоестественного. Скорее противоестественна борьба с такими желаниями — от кого бы она ни исходила. И если уж один политик обвиняет другого в популизме, то должен делать это с учетом возможности самому обратиться к *populus* без посредников.

### Власть сама себе вредит

Оппозиция в свое время, после апреля 1991 года, когда по Беларуси прокатилась волна забастовок и выступлений рабочих, такую возможность упустила. Но, как представляется, не навсегда. Нынешняя власть, имея в своих рядах уникального популиста, все-таки теряет возможность непосредственногно общения с народом. Телешоу, периодически устраиваемые президентом, хотя все еще дают немалый психологический эффект и подогревают нерассуждающую любовь к «всенародноизбранному», но в таких обращениях уже присутствует изрядная доля бюрократизма. Теперь главный барьер между народом и его президентом — не оппозиция, а сама государственная машина, или (что одно и то же) сам президент.

Президент пробует преодолеть этот барьер, избрав адекватный ситуации стиль а-ля Махно. Но шумные выезды на места со скорыми разборками и пока еще без немедленного вынесения смертных приговоров только щекочут праведные чувства обывателя. А в материальном плане ничего дать не могут.

Какое-то время власть еще сможет поддерживать в обществе атмосферу политического романтизма, но ей все больше придется отвечать на вопросы повседневной жизни. А жизнь граждан никогда не была первой необходимостью для государства. Ибо, как говорил Ницше, только там, где кончается государство, начинается человек — не лишний, но необходимый, там звучит песнь того, кто нужен, — единственная и неповторимая.

И нужен, добавим, не кому-то, а самому себе. Популярность нынешнего режима пока еще питается ошибками или даже злоупотреблениями политических предшественником. Но с каждым днем их магнетическое воздействие на *populus* ослабевает. Так, например, многие из электората свой выбор объясняют стремлением избежать худшего. Им пока тяжело признать, что получили они именно худшее. Время поможет преодолеть эту своеобразную стыдливость.

Технократы из числа руководителей и специалистов промышленности и сельского хозяйства, отраслевой и академической науки, по которым кризис ударил очень больно, связывали «с твердой рукой» свои надежды по рационализации управления экономикой. Но нынешняя диктатура весьма далека от просвещенного абсолютизма, для которого такая рационализация была бы логичной. Поэтому в управлении предприятиями по-прежнему действуют приказы, имеющие мало общего с экономической целесообразностью.

Эти люди пока тоже пребывают в сомнениях. Но некоторые из них — например, бывший премьер-министр Михаил Чигирь или министр труда Александр Соснов — уже публично признали, что поставили не на ту лошадку.

### ...и прочие культурные услуги

Сейчас одни деятели белорусской культуры добывают пищу сочинением мадригалов в честь властей, иные оказывают прочие услуги, а большинство просто клянчит деньги на пропитание, не отдавая себе ясного отчета в том, что же все-таки происходит. Не понимая, что прежняя ситуация, когда «искусство принадлежало народу» была неорганичной и поддерживалась исключительно на отнятые у народа деньги.

Поэтому нет ничего удивительного, что в массе своей эти люди оказались неспособными оценить главное — демократические права и свободы, свалившиеся на наши головы вместе с перестройкой и независимостью. Творцы отказываются от свободы творчества в пользу политической лояльности и гарантированного существования. Парадокс?

Перефразируя Энгельса, можно сказать, что эпоха нуждалась в титанах, но не породила их. Да и откуда им можно было взяться в условиях титулярного общества, спецраспределителей и границы «под замком»?

Кстати, о языках. Трудно найти причины того остервенения, с которым власть набросилась на белорусский язык и вообще всякую «беларускасць». Обычным стало кривляние и передразнивание, что порой напоминает дешевый балаган, а в большей степени — неудачную попытку собственноручно вырвать больной зуб. Трудно представить, что такое издевательство над отечественной культурой пройдет бесследно даже для нашего страдающего «колбасной» приземленностью народа.

### Скука в ранге политики

Но общество разделилось не столько по вопросу о языках, столько по представлениям о настоящей и будущей жизни. Например, белорусскоязычные БТ и радио не пользуются популярностью ни у «националистов», ни у их оппонентов. В условиях, когда власть требует обязательной информационной ограниченности и тенденциозности, даже записные «акыны» не могут создать ничего существенного. Обидно только, что вынужденная «местечковость», а попросту говоря — скука, свойственная нашим СМИ в советские времена, ныне возведена в ранг государственной политики.

Уж казалось бы, что команда КВН БГУ, состоящая из людей вроде бы талантливых и достаточно молодых, сможет выйти за пределы цензурируемого спонсором (администрацией президента РБ) поля. Но оказалось, что там попросту нет места для творчества. Поэтому забавно было наблюдать, как при весьма благосклонном отеношении симпатизирующего «интеграторам» российского жюри команда белорусского университета по всем статьям проигрывала студентам из Махачкалы. Дагестанцы, оставаясь российскими гражданами, не переставали быть дагестанцами и для изображения своей современной жизни могли пользоваться самыми разнообразными красками. Чего нельзя сказать о минчанах. Отказав себе в праве быть белорусами, они не стали россиянами, а шутки застойных времен далеко не тот товар, который может кого-либо заинтересовать. Больно за ребят, страну и ее президента.

### Труд, земля и капитал

Рабочий класс Беларуси, который, надо признать, имеет мало общего со своим классическим прототипом, описанном в десятках тысяч томов, вобще-то не способен осознать и эффективно бороться за свои интересы. Но сейчас именно тот случай, когда жизнь реально движется к реальной нищете, которая как ничто иное способствует политическому просвещению. Тем более, что несмотря на объективное различие в целях и труд, и капитал могут в полной мере обеспечить свои интересы только в условиях эффективной экономики.

Интересная и далеко не благоприятная для существующего режима ситуация сложилась в деревне. Белорусского крестьянина, в отличие от его «товарищей по классу» в других постсоциалистических государствах СНГ и Восточной Европы, власти заставляют жить в состоянии социально-экономической раздвоенности: все вокруг мое, но я не хозяин. Причем, как в первые послевоенные годы, в большинстве хозяйств заработная плата или задерживается, или не выплачивается вовсе даже в натуральной форме. Кроме того, колхозы и совхозы годами не рассчитываются за приобретенный в частном секторе скот, молоко и мясо. Если, например, представить, что крестьяне для удовлетворения своих претензий вдруг обратятся в суд, то вопрос с колхозами решится сам по себе — и в пользу крестьян.

Как и всякая неопределенность, нынешняя двойственность может быть достаточно длительной, но не бесконечно. Сегодня колхозника еще удерживает в колхозе возможность что-то получать для своего собственного подсобного хозяйства, которое для него давно стало основным. К слову сказать, постоянно сокращаются не только «сервисные» возможности колхозов (типа выделения тощей лошади для перепашки огорода), но и основной производственный потенциал. Удержать их на плаву в скором времени можно будет лишь методами внеэкономического принуждения — но это не поможет возрождению сельского хозяйства в его социалистической форме. А, значит — и всей экономики страны.

### Вместе

С учетом названных нами обстоятельств — которых в реальной жизни, конечно же, гораздо больше — оппозиция в отличие от режима может непосредственно обращаться к *populus*, ко всем его слоям и классам, политическим партиям, профсоюзам и общественным организациям. И во-вторых, ее пропаганда должна носить интегративный, консолидирующий характер с главным принципом «мы — вместе». Это позволит отвоевывать политическую инициативу — в том числе и среди сторонников нынешнего режима.

## Пратэст расійскіх праваабаронцаў

Расійскі Фонд абароны галоснасці звярнуўся да кіраўніцтва РФ з патрабаваннем абараніць правы карэспандэнтаў расійскіх СМІ, а таксама да ўсіх міжнародных арганізацый, журналістаў і праваахоўнікаў з заклікам падтрымаць сваіх беларускіх калегаў і грамадзянаў, *«чые правы груба парушаюцца ўладамі Рэспублікі Беларусь»*.

У заяве, распаўсюджанай Фондам, адзначаецца, што дзеянні беларускіх уладаў накіраваныя на інфармацыйную ізаляцыю сваёй краіны. Забарона перадаваць адзнятыя матэрыялы карэспандэнтам расійскіх тэлекампаній — ужо не першы выпадак, калі кіраўніцтва Беларусі аказвае ўціск на журналістаў. У заяве падкрэсліваецца, што Рэспубліка Беларусь, як член СНД, за апошнія пяць гадоў падпісала ўсе міждзяржаўныя дакументы, што рэгламентуюць дзейнасць СМІ, а таксама свабодны абмен інфармацыяй. 18 кастрычніка 1996 года Савет кіраўнікоў урадаў СНД зацвердзіў Канцэпцыю фарміравання інфармацыйнай прасторы СНД, у пункце 2 якой гаворыцца, што ў складзе агульных інтарэсаў дзяржаваў Садружасці — *«бесперашкоднае, непадцэнзурнае распаўсюджанне адкрытай інфармацыі аб жыццядзейнасці дзяржаваў-удзельніц СНД і органаў Садружнасці»*. Дзеянні беларускіх уладаў у дачыненні незалежных СМІ Фонд абароны галоснасці ў заяве параўноўвае з часамі таталітарызму, калі выказванне асабістага меркавання няшчадна каралася.

*БелаПАН*

## Аб'яднаць людзей можа агульная будучыня

**Такі адказ далі 53% апытаных жыхароў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.**

У лютым-сакавіку гэтага года Інстытута сацыялогіі Акадэміі навук Беларусі праводзіў сацыялагічнае даследаванне. Тысячы чалавек было прапанавана адказаць на пытанне: *«Што, па-вашаму, можа трывала аб'яднаць людзей розных нацыянальнасцяў, якія жывуць у адной дзяржаве?»* больш чым палова (53%) рэспандэнтаў адказалі: «Агульная будучыня». 39% апытаных указалі на эканамічныя інтарэсы. Кожны чацвёрты (24%) — на агульнае гістарычнае мінулае. Значна меншая колькасць асобаў беларуска-польскага памежжа верыць у палітычныя мэты (18%) і рэлігію (16%).

*БелаПАН*

Калі вы маеце электронную пошту, то свежы нумар СВАБОДЫ вы можаце чытаць напярэдадні выхаду газеты ў свет.

**Кошт электроннай падпіскі ў межах Беларусі — 7 USD у месяц. Даведкі па тэл. 236-89-40**

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010



## Яшчэ адзін сцяг Мірона

*Цяпер — у Віцебску*

**У цэнтры Віцебска на плошчы Перамогі на даху аднаго з самых высокіх жылых дамоў з'явіўся бел-чырвона-белы сцяг.**

Там яго вывесілі ў ноч з 24 на 25 сакавіка, якраз на дзень 79-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Учора, у аўторак, сцяг яшчэ лунаў. Побач са сцягам была прымацаваная запіска з вершам: *«Хай загнуцца ўсе ворагі, што прарочылі гібель маю. Карані маіх продкаў мне дарагі, пра іх славу я песьню пяю»*. Подпіс — Мірон.

Нагадаем, што раней той самы Мірон ужо двойчы вывешваў бел-чырвона-белыя сцягі ў райцэнтры Лёзна Віцебскай вобласці. Адзін раз ён замацаваў сцяг на 50-метровым коміне быткамбіната райцэнтра, другі раз — на мачце электраперадач высокай напругі.

Па факце вывешвання сцяга лёзненская міліцыя нават тады ўзбудзіла крымінальную справу. Але няўлоўнага Мірона «органы» так і не знайшлі. І вось ён зноў пра сябе нагадаў — на гэты раз у Віцебску.

**А.Ч.**

## 3 лялькі выпусцілі паветра

**У панядзелак намеснік старшыні Гродзенскай арганізацыі БНФ С.Мальчык быў выкліканы ў міліцыю, а потым дастаўлены ў Ленінскі райсуд горада.**

С.Мальчык вёў мітынг, прысвечаны гадавіне БНР, які адбыўся ў Гродне 23 сакавіка. Арганізатарам інкрымінуюць выкарыстанне «незарэгістраванай» сімволікі, а таксама надзіманай вусатай лялькі, з якой у «органах» выпусцілі паветра і якая з'яўляецца галоўным *«вещественным доказательством»*. (Пра гэтую ляльку мы пісалі ў мінулым нумары.)

Судовае паседжанне пакуль адкладзена. Не хапіла аргументаў супраць арганізатараў, якія не могуць адказваць за ўсіх жыхароў горада, якія прыйшлі на мітынг, каб адзначыць 79-я угодкі Беларускай Народнай Рэспублікі і прынеслі з сабой сцягі і гэтую ляльку.

**С.А.**

## Ксяндзы выпісваюць новую газету

**У Гродне пачала выходзіць каталіцкая газета «Слова Жыцця». Яна будзе распаўсюджвацца ў Гродзенскай дыяцэзіі.**

Перыядычнасць выдання — раз на два тыдні. Першы нумар выйшаў накладам 6 тысяч на польскай мове і 3 тысячы — на беларускай з асобнымі тэкстамі па-руску. Гродзенскі біскуп Аляксандр Кашкевіч у звароце да чытачоў патлумачыў, што двухмоўны тыраж патрэбны для таго, каб газета займела як найбольшае кола чытачоў. Гэтага таксама вымагаюць прынцыпы Касцёла: *«Каб кожны мог пазнаваць Бога на мове сваіх продкаў»*, — зазначыў ксёндз-біскуп.

Пасля выхаду першага нумара рэдакцыя пачала атрымліваць замовы на газету з парафій, заяўкі складаюць мясцовыя ксяндзы. Мяркуецца, што зараз «Слова Жыцця» будзе выходзіць павялічаным накладам — 12 тысяч на польскай і 8 тысяч на беларускай мове.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**

## Весялосць і знаходлівасць за 52 тысячы рублёў

**Міністэрства юстыцыі зарэгістравала Беларускі клуб вясёлых і знаходлівых (КВЗ).**

Клуб мае на мэце аб'яднаць усе беларускія каманды КВЗ — сёння іх у розных гарадах налічваецца 48. Па словах старшыні Беларускага КВЗ Андрэя Мукавозчыка, па выніках адборачных выступленняў, якія пачнуцца 4 красавіка, сфарміруецца вышэйшая ліга клуба (8-10 каманд) і першая (каля 30 каманд).

Беларускі КВЗ плануе 6 красавіка адзначыць дзесяцігоддзе клуба, у святкаванні возьмуць удзел чэмпіёны мінулых гадоў. Каб атрымаць членскі білет Беларускага КВЗ, трэба заплаціць уступны ўзнос 52 тысячы рублёў.

*БелаПАН*

**УКРАІНА**

## Сёлета ўсе «чарнобыльцы» атрымаюць новае жыллё

**Урад Украіны будзе не толькі будаваць новыя дамы для «чарнобыльцаў», але і купляць для іх гатовае жыллё.**

У 1997 г. Украіна вырашыла завяршыць адсяленне людзей з забруджаных тэрыторый. Падлічана, што купля гатовага жылля не толькі паскорыць перасяленне сем'яў, але і абыдзецца ў 4,5–5 разоў танней за будаўніцтва новых паселішчаў. Прыярытэтнымі задачамі ўкраінскі ўрад лічыць таксама завяршэнне будаўніцтва школаў і дарог ва ўжо створаных паселішчах для «чарнобыльцаў».

## 30 працэнтаў беднякоў

**У 1996 годзе ўзровень беспрацоўя ва Украіне ўзрос у 2,2 разы і складае сёння амаль 1,5% працаздольнага насельніцтва.**

Пра гэта паведаміў намеснік міністра эканомікі Украіны А.Яроменка. Па ягоных словах, на працягу 1996 г. не ўдалося павысіць рэальны ўзровень заработнай платы, наадварот — яна знізілася на 14%. Паводле інфармацыі А.Яроменкі, пятая частка працаздольнага насельніцтва краіны ў 1996 годзе знаходзілася ў вымушаных водпусках: у прамысловасці, на транспарце, у будаўніцтве кожны трэці, а ў лёгкай прамысловасці — дзве трэція занятых не працавалі. Больш за 30% насельніцтва Украіны па ўзроўні афіцыйных даходаў знаходзяцца за рысай беднасці.

Для параўнання: у Беларусі сёння афіцыйны ўзровень беспрацоўя складае 4,0%. Заработная плата ў пераліку на долары за 1996 год знізілася ў цэлым на 33% (у прамысловасці — на 27,9%, у сельскай гаспадарцы — на 42,1%).

## Кіеў – сталіца наркаманаў?

**Па дадзеных украінскіх медыкаў, 280 тысяч жыхароў Кіева злоўжываюць алкаголем або маюць праблемы з прычыны ўжывання наркотыкаў.**

Гэта азначае, што кожны дзесяты жыхар украінскай сталіцы мае патрэбу ў кваліфікаванай медычнай дапамозе. Наркаманія імкліва распаўсюджваецца сярод моладзі. Статыстыка сведчыць: кожны пяты навучэнец ПТВ курыў або курыць марыхуану, кожны другі-трэці — прымаў транквілізатары або псіхатропныя сродкі, амаль трэцяя частка студэнтаў ВНУ ужывае розныя наркотыкі.

Сталіца Украіны — выгадны рынак для збыту наркотыкаў. Грам какаіну ў Кіеве каштуе ў 2-3 разы даражэй, чым у Германіі. Кошт адной дозы гераіну — 450–500 грыўнаў (245–275 USD), марыхуаны — 20–30 грыўнаў (11–16 USD), опію — 120–150 грыўнаў (65–80 USD). У асноўным пастаўшчыкамі наркотыкаў з'яўляюцца жыхары Афрыкі.

*БелаПАН — УНІАН*

**ТРАДЫЦЫІ**

# Вялікдзень – Хрыстова Уваскрасенне

**Заўтрашні дзень для каталікоў святочны, заўтра — Чысты чацвер. У нядзелю ж яны будуць адзначаць свята, якое разам з Калядамі (Нараджэннем Хрыстовым) з'яўляецца самым вялікім для ўсіх хрысціянаў, — Вялікдзень, або Хрыстова Уваскрасенне.**

Сёлета Вялікдзень вернікаў каталіцкай канфесіі прыпадае на 30 сакавіка, а праваслаўныя сваё свята Хрыстова Уваскрасення будуць адзначаць 27 красавіка. Як вы памятаеце, Царква і Касцёл вядуць часазлічэнне паводле двух розных календароў: каталікі ўжываюць Грыгарыянскі (больш дакладны), а праваслаўныя — Юліянскі каляндар. Розніца паміж імі, нагадаем, складае сёння 13 дзён. Але каталікі будуць адзначаць Вялікдзень, як бачым, на 28 дзён раней за праваслаўных.

Чаму так адбываецца? Першнаперш трэба памятаць, што Вялікдзень — гэта рухомае свята, г. зн. дзень свята прыпадае на кожны год асобна. Але відавочна, што каталікі і праваслаўныя па-рознаму вызначаюць дату ўкрыжавання і ўваскрасення Хрыста.

### Год смерці Хрыста

Праблема вызначэння даты святкавання сягае сваімі каранямі ў самы пачатак хрысціянства. Нараджэнне Хрыстова нідзе не зафіксавана, а дату смерці Хрыста мы ведаем толькі прыблізна. У Евангеллі сказана, што ўкрыжаванне адбылося ў час старажытнагабрэйскай Пасхі. І калі мы прымем думку царкоўных мысляроў, якая панавала праз стагоддзі, што Тайная вячэра, падчас якой было аб'яўлена аб сакраменце Еўхарыстыі (пераўтварэнне хлеба і віна ў плоць і кроў Хрыста), мела месца пад канец Вялікага посту, то атрымліваецца, што Хрыстос быў укрыжаваны на 14 дзень габрэйскага месяца Нізан. Аднак старажытныя габрэі прытрымліваліся месяцавага календара, і месяц Нізан пачынаўся з маладзіка адразу пасля вясновага раўнадзенства. Такім чынам, Хрыстос пакутваў падчас першай поўні вясны — гэты факт шырока адлюстравалі многія мастакі, якія малявалі апошнія дні Хрыста. А дата Уваскрасення, адпаведна, павінна быць 16 днём Нізана.

На жаль, мы не ведаем дакладна год смерці Хрыста. Вылічэнні, якія звязваюць нараджэнне Сына Божага з 753 годам *ab urbe condita*, г. зн. ад заснавання горада (Рыма), не маюць сілы, бо ў адпаведнасці з Новым Запаветам цар Ірад, які памёр у 749 г. ад заснавання Рыма, у час нараджэння Хрыста быў яшчэ жывы. Мы ведаем таксама, што Хрыстос пакутваў пры Понтыі Пілаце — але ж Пілат быў пракуратарам Юдэі восем або дзевяць гадоў. А паколькі месяцавы год не адпавядае сонечнаму, нейкую карэляцыю паміж габрэйскім (месяцавым) і сонечным (напрыклад, Юліянскім) календаром можна рабіць толькі тады, калі дакладна вядомы год. У любым выпадку, на працягу першых стагоддзяў хрысціянства было прынята святкаваць Уваскрасенне Хрыстова на наступны дзень пасля габрэйскай Вялікай суботы.

### Новы каляндар

У 1582 годзе Папа Рымскі Грыгорый XIII увёў замест Юліянскага новы, Грыгарыянскі каляндар, які астранамічна быў больш дакладны. Нагадаем, што ў XVI ст. адбылося скарачэнне календара на 10 дзён. Пра спрэчкі вакол уводзення новага календара, якія вяліся паміж прадстаўнікамі розных канфесій, мы ўжо пісалі ў першым нумары гэтага года. Але нават калі б Рым і Візантыя пагадзіліся тады ці пазней наконт новага календара, усё роўна заставалася б праблема дня святкавання Вялікадня, Уваскрасення Хрыстовага.

У выніку на працягу амаль двух тысячаў гадоў Рым і Канстанцінопаль святкуюць Вялікдзень то адначасова, то з розніцай да чатырох тыдняў, як сёлета. Дарэчы, Папа Грыгорый XIII, схіляючы Канстанцінопаль прыняць новы каляндар, імкнуўся таксама пакласці канец гэтым разнагалоссям са святкаваннем Вялікадня. Іншымі словамі, ён хацеў, каб увесь хрысціянскі свет святкаваў Вялікдзень паводле рымскага звычаю на першую поўню пасля раўнадзенства. Але Усяленскі Патрыярх і падначаленыя яму цэрквы рашуча адмовіліся гэта зрабіць. Руская праваслаўная царква і дагэтуль святкуе Уваскрасенне Хрыстова ў нядзелю на поўню пасля першага вясновага маладзіка.

### «Храналогія» Андрэя Рымшы

Сваё адлюстраванне барацьба вакол уводзення новага календара і вызначэння даты Вялікадня знайшла і ў творах старажытнабеларускай літаратуры. Самы яскравы прыклад — «Храналогія» Андрэя Рымшы, якая з'явілася ў траўні 1581 г., за год да ўвядзення Грыгарыянскага календара.

Сам твор складаецца з дванаццаці строфаў: кожная пачынаецца з назвы месяца ў трох формах — па-лацінску, па-габрэйску і па-беларуску, а далей ідзе апісанне, што рабілася ў гэтым месяцы «за старых векаў»; у канцы — кароткая мараль. Цікава, што Андрэй Рымша ігнаруе неадпаведнасці паміж габрэйскім месяцавым і хрысціянскім сонечным календарамі.

Нараджэнне Хрыстова падаецца, вядома ж, 25 снежня. Дзень укрыжавання Хрыста Рымша датуе 25 сакавіка. У абедзвюх (усходняй і рымскай) традыцыях гэтая дата тады адзначалася як дзень Звеставання (Дабравешчання), дзень зачацця Хрыста — зусім натуральна за дзевяць месяцаў перад ягоным нараджэннем.

У Пісанні няма ніякіх дакладных указанняў на дату нараджэння Хрыста, нават на пару года. Магчыма, што дата 25 снежня была прынятая часткова для таго, каб стварыць супрацьвагу розным паганскім святам зімовага сонцастаяння, а часткова з прычыны празрыстай сімволікі: Хрыстос, сонца справядлівасці, перамагае цемру чалавечага граху, які лёгка асацыіруецца з лютай зімой. Але з трэцяга боку Хрыстос — увасабленне чалавечай дасканаласці — у сваім зямным жыцці павінен быў пражыць канкрэтны час, канкрэтную, сімвалічную колькасць гадоў. Зямны шлях пачынаўся з зачацця — а канчаўся ўкрыжаваннем, і лагічна было б, каб смерць зямная прыйшлася на той самы дзень, што і зачацце — Дабравешчанне. А паколькі смерць на крыжы адназначна мела месца ўвесну — адсюль і зімовая дата нараджэння.

Гэткі сімвалізм праз стагоддзі існаваў у свядомасці хрысціян, і было б памылкай ігнараваць яго — няхай мы і не ведаем, калі дакладна Хрыстос быў укрыжаваны. І тым не менш, хоць прывязаны да месяцавага календара Вялікдзень не можа быць дакладна вызначаны ў сонечным, гэта не стварала практычных праблем для царквы, а дзень 25 сакавіка як дата Уваскрасення сягае ў гісторыю як мінімум да часоў св.Аўгусціна. І, як бачым, так было на працягу 1200 год — да часоў, калі Рымша напісаў свой твор.

### Беларускі Вялікдзень

У беларускай дахрысціянскай традыцыі свята Вялікадня з'яўлялася вясновым святам у гонар абуджэння прыроды і надыходу палявых работ. Менавіта з гэтым святам старажытныя беларусы звязвалі прыход новага года. Нагадаем, што характэрная асаблівасць беларускага Вялікадня, якая розніць нас ад іншых народаў, — гэта хаджэнне валачобнікаў (валачобніцтва), спяванне ў першы дзень свята валачобных песень. Іхні абрадавы сэнс — пажаданне гаспадару плёну на ніве, прыплоду ў статку і шчаслівай долі ў сям'і.

Дагэтуль захавалася традыцыя гатаваць на Вялікдзень шмат страваў (асабліва мясных, што раней было асабліва актуальна, бо заканчваўся 7-тыднёвы перадвелікодны Вялікі пост), фарбаваць яйкі (пісанкі), пячы булкі, ладзіць святочныя застоллі. У гэтым годзе ў нашай шматканфесійнай Беларусі светлае свята Вялікадня фактычна расцягваецца на месяц. У гэтую нядзелю праваслаўныя могуць парадавацца і пацешыцца разам са сваімі роднымі і сябрамі — каталікамі, а ў канцы красавіка вернікі каталіцкай канфесіі разам з праваслаўнымі яшчэ раз скажуць словы радасці — «Хрыстос Уваскрос!». І тройчы пацалуюцца, і яшчэ раз з'ядуць чырвонае яйка.

**Вера РЫЧ** *(Лондан)*
**Гальяш ПАТАПОВІЧ**

Рэкламны аддзел газеты СВАБОДА
ЗАПРАШАЕ НА ПРАЦУ
рэкламных агентаў з вопытам работы
Аплата — 36% ад сумы заказа
Даведкі па тэл.: 236-24-41 з 10 да 17

ОФСЕТНАЯ БУМАГА ПО САМОЙ НИЗКОЙ ЦЕНЕ
в пачках по 500 листов (2,5 кг)
Формат А4, плотность 80, белизна 82%
Цена 75 000 за пачку
Тел.: 8-0172-100-253

© СВАБОДА Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by СВАБОДА ў Internet: http:\\www.gis.minsk.by Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 41.430
Нумар падпісаны ў друк 25.03.97 (15:00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 285